# ПЛОТКІН МАЙСЕЙ РУВІМАВІЧ.
# ДА 100 ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Савецкі эканоміка-географ, падарожнік, даследчык Поўначы Майсей Рувімавіч Плоткін нарадзіўся 20 траўня 1914 г. у г. Бабруйск. Пасля сканчэння сямігодкі, працаваў рабочым, шафёрам Бабруйскага лесакамбіната, інструктарам тэхнапрапаганды, супрацоўнікам НДІ харчовай прамысловасці БССР. У 1936–1940 гг. М. Плоткін вучыўся на геафаку мінскага педінстытута, у 1940–1944 гг. у аспірантуры пры кафе-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дры эканамічнай геаграфіі Маскоўскага педінстытута. Удзельнік абароны Масквы. У 1943–1947 гг. працаваў навуковым супрацоўнікам Маскоўскага філіала Арктычнага НДІ Галоўнага Паўночнага Марскога шляху, удзельнічаў у навуковых экспедыцыях на Поўнач. Кандыдат геаграфічных навук (1945). У 1947–1951 гг. М.Р.Плоткін працаваў на Беларусі: загадчык кафедраў геаграфіі Пінскага настаўніцкага (1947–1949), эканамічнай геаграфіі Магілёўскага педагагічнага (1949–1950) інстытутаў (чытаў курсы эканамічнай геаграфіі і геаграфіі насельніцтва), у вну г. Мінска (1951).

У 1951–1960-х гг. працаваў ў Казахскім дзяржуніверсітэце, у 1960–1980-х гг. – прафесарам кафедры эканамічнай геаграфіі Маскоўскага педінстытута. Яго пяру належыць больш за 100 прац і артыкулаў, у т.л. некалькі манаграфій, вострадэфіцытных падручнікаў для вну: «Асновы індустрыяльнай вытворчасці», «Асновы прамысловай вытворчасці», «Геаграфія сельскай гаспадаркі Казахстана».

***І.М. Шаруха***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова